■ 70 гадоў без вайны

Два полі Аляксандра Слабады

На ваенным ён атрымаў ордэн Чырвонага Сцяга, на мірным — залатую зорку Героя Сацыялістычнай Працы

Кожны год Аляксандр Іванавіч Слабада ездзіць на магілу бацькоў. Ён развітаўся з імі ў далёкім 1940-м, калі ішоў у Чырвоную Армію. Выпраўляць выйшла ўся радня. Маці захлыналася слязьмі: быццам прадчувала, што больш не ўбачацца...

У 1942-м фашысты расстралялі Івана Сцяпанавіча і Вольгу Канстанцінаўну за сувязь з партызанамі. Сваякі знайшлі іх целы ў гарадскім парку і пахавалі, а сын, калі вярнуўся з вайны, паставіў ім помнік. І штогод ездзіць туды, дзе ад колішняга жыцця не засталося амаль нічога — Асвейскі раён (цяпер Верхнядзвінскі), адкуль ён родам, быў амаль цалкам знішчаны гітлераўцамі.

Штогод шлях даўжынёй у 600 кіламетраў. Шмат часу, каб узгадаць шчаслівае дзяцінства і... вайну, якая знішчыла самае дарагое — родны кут і блізкіх. Пакланіўшыся роднай зямлі і бацькам, ён з палёгкай вяртаецца дамоў. І спадзяецца, што сустрэнецца з імі праз год. А між іншым, Аляксандру Іванавічу літаральна пазаўчора споўнілася 95 гадоў!

На вайну

Яго дзяцінства прайшло ў вёсцы Дубровы. Жылі бедна. Пад адным дахам туліліся тры пакаленні Слабады: дзед Сцяпан і баба Паліна, бацькі, Аляксандр і яго тры браты.

Скончыўшы сямігодку, Саша вырашыў паступаць у Полацкі лесатэхнічны тэхнікум. Не хапіла ўсяго паўбала... У дзесяцігодку хадзіць далёка — 12 кіламетраў. Трэба было б здымаць жыллё, плаціць за харчаванне. А ў бацькоў такіх грошай не было. Мусіў застацца ў калгасе. Працаваў механізатарам, трактарыстам, потым прыйшоў час ісці ў армію.

Восеньскай раніцай 1940 года бацька запрог каня. Маці, бабуля і цётка не маглі стрымаць слёз. «Ну, хопіць, — не вытрываў бацька. — Не на вайну ж выпраўляем!»

Дняпро, заліты крывёю

А аказалася, што на вайну... 53-я стралковая дывізія, у якой служыў Саша Слабада, за два тыдні да пачатку Вялікай Айчыннай з Паволжа была перакінута ў Беларусь. І ўжо 25 чэрвеня — першая сутычка з ворагам. Сем дзён іх 27-ы асобны разведвальны батальён адбіваў атакі гітлераўцаў на рацэ Друць пад Бялынічамі, потым змагаўся з ворагам на Буйніцкім полі.

Гэта была няроўная сутычка з ворагам, дзе савецкая пяхота стаяла насмерць. Тады, у ліпені 1941-га, Аляксандру Слабадзе проста пашчасціла не застацца на тым полі назаўсёды.

— Не страшна было? — пытаюся ў Аляксандра Іванавіча.

Побач з ветэранам — заўсёды дзеці. Ім так і хочацца дакрануцца да залатой зоркі, якая зіхаціць на святочным пінжаку.

— На вайне заўсёды страшна. Той, хто зараз кажа інакш, па-сапраўднаму не нюхаў пораху. Як гэта не страшна, калі справа і злева свішчуць кулі, калі наперадзе і ззаду рвуцца снарады? Вядома, страшна! Увесь Дняпро быў заліты крывёю. На Буйніцкім полі было пекла. Абаранялі горад да апошняга патрона. Адтуль змаглі пасці толькі тыя, хто быў лёгка паранены. Без танкаў, без прыкрыцця з паветра пяхота стаяла насмерць. Фронт адышоў ад Магілёва на дзвесце з лішнім кіламетраў, а горад не здаваўся. Гэта тая ж Брэсцкая крэпасць, толькі буйнейшага маштабу.

Ветэран і сёння памятае, як крычаў свайму таварышу, кулямётчыку Васю Якавенку, каб той мяняў пазіцыю:

— А ён на мяне: «Саня, я паранены!» Я да яго паўзком: у Васі перабіта ключыца. А з намі медсястра была, худзенькая такая. Падбегла, схапіла на плечы і пацягнула ў яр. Я раскапаў кулямёт, які засыпала зямлёй. Адкопваю дыскі — кроў з пазногцяў цячэ. Пачысціў ад пяску, перазарадзіў і націснуў на курок: праверыць, працуе ці не. А камандзір крычыць: «Што ж ты робіш! Патроны эканоміць трэба!»

У баях на Буйніцкім полі Аляксандр Слабада падбіў два танкі. За абарону Магілёва быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Такую ж узнагароду атрымаў праз год — за абарону Масквы.

«Немцам пад Масквой было горача»

З цяжкім сэрцам абаронцы Магілёва пакідалі горад. Але загад ёсць загад. Трэба было злучацца з перадавымі часцямі.

— Нам пашанцавала з камандзірам. Добра памятаю яго прозвішча: Сцяпанаў, — расказвае ветэран. — Днём ішлі, ноччу праводзілі разведку. Крочылі па балотах, лясах — там, дзе немцаў не было. Зойдзеш, бывае, у вёску, дадуць табе акрайчык хлеба, а мы ніткай яго рэжам — каб нікога не пакрыўдзіць. І гэта — на 20 чалавек. Перакусіш, балотнай вадзічкай зап'еш — і ноччу зноў рухаешся.

«Увесь Дняпро быў заліты крывёю. На Буйніцкім полі было пекла. Абаранялі горад да апошняга патрона».

У канцы жніўня прыйшлі да сваіх. Аляксандр Слабада ваяваў пад Ельняй. Яго 53-я дывізія трапіла ў акружэнне, з якога выбралася ў раёне Смаленска. Затым былі баі пад Вязьмай, Малаяраслаўцам, Падольскам, контрнаступленне пад Масквой...

Падчас адной з разведак у тыл праціўніка летам 1942 года Аляксандра Слабаду параніла. У падраздзяленне аднапалчане неслі яго на плашч-палатцы. Так і раку пераплывалі. Некалькі дзён праляжаў у медсанбаце, як пачалася газавая гангрэна. На самалёце пераправілі ў Маскву, у эвакашпіталь № 7.

— Хірург паглядзеў на мяне і кажа: «Будзем ампутаваць», — успамінае франтавік. — Я тады такі гвалт падняў: маўляў, за мяне тады ніводная дзяўчына замуж не пойдзе! Каму я патрэбен буду! Паслухаў ён мяне, разрэзаў рану, а кроў як ударыла фантанам — ажно да столі. Прамылі, пачысцілі. Потым, праўда, гады два рана адкрывалася, але, дзякуй Богу, застаўся з нагой.

У партызанах

— Калі яшчэ ляжаў у шпіталі, папрасіў, каб пусцілі пагуляць па Маскве: ніколі ж не бачыў сталіцу! — узгадвае Аляксандр Іванавіч. — Я ўжо лейтэнантам быў. Надзеў гімнасцёрку, на якой два баявыя ордэны зіхацелі. Зайшоў у вагон метро — усе ўсталі: маўляў, сядайце. Я не зразумеў, у чым справа. Потым заходжу ў цырульню. Падстрыглі мяне, пагалілі, адэкалонам памазалі. Пытаюся, колькі плаціць? А яны мне: «Мы такіх герояў, як вы, абслугоўваем бясплатна»...

Пасля выпіскі Аляксандр Слабада ваяваў камандзірам роты аўтаматчыкаў 5-й гвардзейскай дывізіі на Калінінскім фронце. Але на перадавой доўга не затрымаўся. У снежні 1942 года яго накіравалі ў тыл праціўніка — для ўдзелу ў партызанскім руху.

— Мяне часта пытаюць, чаму я «ўцёк» з дзеючай арміі ў партызаны, — гаворыць ветэран. — Такі быў загад. Выклікалі мяне аднойчы і пытаюць: «Ты з Беларусі?» — «Так» — «Хочаш паехаць на Радзіму, паваяваць?» — «Дык там жа нашы! Як я паеду?» — быў здзіўлены я. У пачатку разгортвання партызанскага руху не хапала кадраў. Вось і спатрэбілася некалькі камандзіраў, каб узначаліць партызанскія атрады.

Так Аляксандр Слабада аказаўся на роднай Віцебшчыне. Яго атрад №3 партызанскай брыгады імя Ленінскага камсамола дзейнічаў на тэрыторыі Суражскага і Гарадоцкага раёнаў. Здавалася, зусім побач з роднай хатай. Але хаты ўжо не было, як і бацькоў, якіх фашысты расстралялі ў верасні 1942 года.

Аляксандр люта помсціў ворагу. Але падчас адной з дыверсій камандзіра атрада параніла. І на табе — у тую ж самую нагу! Але яму зноў пашанцавала: у той вечар у тыл праціўніка прыляцеў самалёт, які і пераправіў партызана на Вялікую зямлю. На гэтым вайна для Аляксандра Слабады закончылася. Яго прызналі нестраявым, далі інваліднасць. «А што я буду рабіць? — пытаюся. — Вёску маю спалілі гітлераўцы, бацькоў расстралялі. Куды ж мне ісці?» Так і апынуўся на камсамольскай рабоце. У 1944-м Аляксандра Іванавіча выбралі сакратаром Гомельскага абкама камсамола.

Насуперак Хрушчову

У 1946 годзе Аляксандра Слабаду накіравалі на вучобу ў Вышэйшую партыйную школу ў Мінск. Тут ён і пазнаёміўся з будучай жонкай. З Нінай Паўлоўскай у іх шмат было агульнага: віцябчанка, партызанка, якая пусціла пад адход не адзін варожы цягнік... На яе парадным кіцелі ззялі тры ордэны Айчыннай вайны, баявыя медалі.

Ужо ўдваіх яны крочылі па жыцці. Выхавалі сына і дачку, пазней дачакаліся ўнукаў і праўнукаў. Адну за адной Аляксандр Іванавіч мяняў высокія пасады: сакратар Бабруйскага абкама камсамола, другі сакратар Слуцкага райкама партыі, старшыня Слуцкага райвыканкама, у 1961-м узначаліў Любанскі райкам партыі.

Аляксандр СЛАБАДА. 1942 год.

Гэта быў не самы лёгкі час. На вядомым «кукурузным» пленуме ЦК КПСС Хрушчоў паставіў задачу: 15-20% ад пашы аддаваць пад кукурузу. «Гэта азначала заараць травы, — гаворыць Аляксандр Слабада. — Я тады сабраў найбольш аўтарытэтных кіраўнікоў калгасаў, а яны мне кажуць, што гэтага ні ў якім разе дапусціць нельга: загубім жывёлагадоўлю. Паехаў я тады ў Мінск, да Кірыла Мазурава. Ён уважліва выслухаў мяне і параіў прыслухацца да кіраўнікоў гаспадарак. Але, маўляў, уся адказнасць — на мне».

За невыкананне ўказанняў Хрушчова можна было пазбавіцца і пасады, і партыйнага білета. Але, на шчасце Аляксандра Іванавіча, кукуруза ў тым годзе так і не вырасла. Вясна 1962-га была вельмі халоднай і дажджлівай. Кукуруза, якая паднялася ў суседніх раёнах на сантыметраў пяць, уся пасінела. А на палетках Любаншчыны — трава па пояс!

— На наступны год на Любаншчыну прыехалі Кісялёў з Мазуравым, — успамінае ветэран. — Просяць: «Пакажы нам, Аляксандр Іванавіч, раён візуальна. Але без паказухі». Паехалі. «А што гэта за стагі?» — пытаюць. А я і тлумачу, што не паспелі скарміць. Падышлі бліжэй. Кірыл Трафімавіч выцягнуў са стога жмук травы і пытае ў Кісялёва: «Чым пахне, Ціхан Якаўлевіч?» — «Гарбатай», — гаворыць той. А затым пацісну́ў мне руку і падзякаваў за тое, што дзейнічаў як сапраўдны гаспадар.

У той час, як у іншых раёнах з прадуктамі быў дэфіцыт, на Любаншчыне вытворчасць мяса, малака і яек набірала абароты. За высокія паказчыкі ў развіцці жывёлагадоўлі ў сакавіку 1966 года Аляксандру Слабадзе прысвоілі званне Героя Сацыялістычнай Працы.

«Хірург паглядзеў на мяне і кажа: «Будзем ампутаваць», — успамінае франтавік. — Я тады такі гвалт падняў: маўляў, за мяне тады ніводная дзяўчына замуж не пойдзе! Каму я патрэбен буду!»

Каштоўнасць мірнага дня

У 1970 годзе Аляксандр Іванавіч пераехаў у Мінск. Працаваў намеснікам старшыні Рэспубліканскага камітэта народнага кантролю БССР.

— Трэба было займацца бюракратычнай дзейнасцю, а я прызвычаіўся да нізавой работы, — кажа ён. — У той час у народнага кантролю асаблівых правоў не было. Мы маглі прыцягнуць парушальнікаў толькі да адміністрацыйнай адказнасці. Сваім становішчам ніколі не карысталіся. Працавалі самааддана, жылі сціпла і сумленна.

26 гадоў Аляксандр Слабада ўзначальваў Мінскі абласны савет ветэранаў. Ганаровы грамадзянін Любані і Мінскай вобласці тройчы ўдзельнічаў у парадзе Перамогі ў Маскве. І кожны раз, чаканячы крок па Краснай плошчы, успамінаў, як маладым лейтэнантам знаёміўся са сталіцай Савецкага Саюза. Толькі цяпер над галавой — мірнае неба, а тады ў самым разгары была вайна.

— Каб надалей такога не паўтарылася, трэба палюбіць сваю Радзіму, — перакананы ветэран. — Фашызм перамаглі патрыятызм і дружба народаў. Трэба цаніць кожны мірны дзень, падораны сённяшнім пакаленням салдатамі Перамогі.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА і з архіва ветэрана

■ Меркаванне

МІР: РАЗМОВЫ І СПРАВЫ

Адсутнасць вайны ў краіне — гэта адна з тых нешматлікіх рэчаў, якія ўспрымаюцца як дадзенасць і, як правіла, не цэняцца. Адносіны да гэтага рэзка мяняюцца ад абыякавасці ў бок вялікай зацікаўленасці ў выпадку, калі вайна ўсё ж здараецца.

Праз некалькі гадоў пасля распаду СССР у еўрапейскай частцы былога Савецкага Саюза ў многіх пераважаў пункт гледжання, што вайна ў Еўропе больш немагчымая і што ў XXI стагоддзі можна не марнаваць час на абмеркаванне яе магчымасці ў еўрапейскім рэгіёне і тым больш на прадухіленне патэнцыйных пагроз, якія могуць прывесці да вайны. Крыху пахіснулі гэты пункт гледжання падзеі ў Югаславіі, што была пад працяглай бамбардзіроўкай авіяцыі НАТА, але ўсё ж дастаткова хутка ён зноў узяў верх. На гэтым фоне пастаянныя выступленні Прэзідэнта Беларусі, у якіх ён заклікаў не памыляцца адносна магчымасці новых войнаў на тэрыторыі Еўропы і рабіць актыўныя захады па ўмацаванні еўрапейскай бяспекі, некаторымі ўспрымаліся як непатрэбныя ў XXI стагоддзі. На жаль, час паказаў абгрунтаванасць заклапочанасці беларускага лідара: самазаспакаенне наконт магчымасці развязвання новых войнаў у Еўропе з'яўляецца небяспечнай памылкай. Яно можа прывесці да новых ваенных канфліктаў у выпадку, калі не будуць прыняты рашучыя меры па выбудоўванні новай сістэмы бяспекі, здольнай замяніць ранейшыя дамоўленасці, якія зніклі разам з крахам СССР.

Дзейнасць Беларусі ў галіне забеспячэння міру ў рэгіёне і наогул на планеце не абмяжоўваецца толькі заявамі, закліканымі вярнуць партнёраў у рэчаіснасць, прымусіць іх зняць ружовыя акуляры. Найперш за ўсё, гэта планамерная дзейнасць у міжнародных арганізацыях, закліканая забяспечыць баланс захавання рознымі дзяржавамі сваіх і чужых інтарэсаў. На пляцоўцы ААН беларуская дэлегацыя пастаянна падтрымлівае ініцыятывы, накіраваныя на канструктыўнае вырашэнне канфліктаў, якія існуюць у свеце. Іншая справа, што, як паказвае практыка, уплыў ААН на многія сусветныя праблемы вельмі нязначны ў сувязі з тым, што асобныя буйныя дзяржавы лічаць сябе свабоднымі ад захавання інтарэсаў усёй міжнароднай супольнасці, дбаючы ў першую чаргу аб уласных нацыянальных інтарэсах.

Велізарнае значэнне для забеспячэння міру ў Еўропе мае актыўнасць Беларусі па вырашэнні ўкраінскага крызісу. З самага яго пачатку беларускі Прэзідэнт выказваў ініцыятывы па пасрэдніцтве краіны ў супакаенні канфліктуючых бакоў. Да ініцыятыў, на жаль, першапачаткова не прыслухаліся, што сур'ёзна паўплывала на развіццё канфлікту на негатыўным сцэнарыі. Праз некалькі месяцаў канструктыўная роля Беларусі была па заслугах ацэнена, што прывяло да правядзення ў нашай краіне значных перамоў па вырашэнні канфлікту, якія змаглі яго прытушыць, замарозіўшы найбольш кровапралітную яго стадыю. На жаль, супярэчнасці, што існуюць паміж ЗША і Расіяй, не дазваляюць ім прыйсці да поўнай згоды па ўрэгуляванні сітуацыі ва Украіне. Аднак эксперты адзначаюць, што Беларусь зрабіла і працягвае рабіць максімум магчымага для вырашэння канфлікту, часта нават пераўзыходзячы тыя чаканні ад сваёй ролі, якія меліся ў іншых краін. Перспектывы вырашэння ўкраінскага крызісу Беларусь таксама звязвае з дзейнасцю АБСЕ, што прывяло да значнага росту аўтарытэту нашай краіны ў гэтай арганізацыі.

Не трэба забываць і пра тое, што праблемы забеспячэння міру ў еўрапейскім рэгіёне самым цесным чынам звязаны са здольнасцю асобных дзяржаў забяспечваць мір і згоду на сваёй уласнай тэрыторыі. У гэтым плане беларуская мадэль развіцця можа ацэньвацца як узорная для ўрэгулявання патэнцыйных унутраных супярэчнасцей і рознагалоссяў і быць узята на заметку іншымі краінамі. Яе ключавымі элементамі з'яўляюцца забеспячэнне моўнай талерантнасці, верацярпімасці, пастаянная барацьба з карупцыяй і злачыннасцю, не дэкларуемая, а рэальная здольнасць дзяржавы забяспечыць высокія сацыяльныя стандарты для грамадзян. Стратэгічна верным аказалася прынятае на рэферэндуме сярэдзіны 1990-х гадоў рашэнне аб выкарыстанні ў Беларусі дзвюх дзяржаўных моў. Дзяржаўныя органы знаходзяцца ў пастаянным кантакце з рэлігійнымі суполкамі, ствараючы атмасферу верацярпімасці і талерантнасці. Што датычыцца барацьбы з карупцыяй, то практычна кожны год вылучаюцца новыя ініцыятывы і ўдасканальваецца заканадаўства ў гэтай сферы, што дазваляе эфектыўна змагацца з гэтай язвай постсавецкіх краін. У сферы барацьбы са злачыннасцю Беларусь па паказчыках усё бліжэй падыходзіць да вядучых еўрапейскіх дзяржаў, якія не перажывалі такой маштабнай ломкі сацыяльных інстытутаў, як тая, што адбывалася ў 1990-х гадах пасля краху СССР. Што да сацыяльных стандартаў, то насельніцтва па заслугах ацэньвае нізкую камунальную плату, бясплатную медыцыну і нізкія тарыфы на праезд у грамадскім транспарце.

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук

■ Добрая навіна

ЦЭНТР ДЛЯ СІЛАВІКОЎ

Сучасны цэнтр фізічнай падрыхтоўкі сілавікоў адкрыўся ў Гомелі. Цяпер супрацоўнікі ўсіх праваахоўных структур маюць усе неабходныя ўмовы, каб падтрымліваць форму і быць гатовымі для абароны спакою грамадзян.

Трохпавярховы комплекс — гэта сучасны спартыўны аб'ект для ўсіх узроўняў сілавой падрыхтоўкі, неабходных супрацоўнікам міліцыі і іншых ведамстваў. У прыватнасці, ёсць залы барацьбы, гульнявых відаў спорту, трэнажорны комплекс з абсталяваннем апошняга пакалення, кабінеты для трэнераў і медыкаў... Ёсць нават некалькі нумароў гасцініцы — для супрацоўнікаў, якія суправаджаюць транспартныя сродкі.

Цэнтр належыць Дэпартаменту аховы і цалкам пабудаваны за сродкі гэтага ведамства. Увод у эксплуатацыю новага спартыўнага аб'екта дазволіць не толькі нарошчваць спартыўны патэнцыял супрацоўнікаў праваахоўных органаў, але ўрэшце і сэканоміць сродкі. Больш не прыйдзецца плаціць за арэнду спартыўных памяшканняў іншым арганізацыям.

На другім паверсе комплексу адкрыта гісторыка-дэманстрацыйная зала, прысвечаная гісторыі службы Дэпартамента аховы. У ёй можна пабачыць прылады, якія калісьці дапамагалі праваахоўнікам папярэдзіць пранікненне злодзея ў памяшканне. Сёння многія з іх выглядаюць як сапраўдныя рарытэты і даўно не выкарыстоўваюцца, але ж кіраўніцтва лічыць, што маладыя павінны ведаць, якім чынам несла сваю службу папярэдняе пакаленне. Менавіта таму асобныя экспазіцыі прысвечаны пэўным гістарычным перыядам. Напрыклад, часу, калі супрацоўнікі службы прымалі актыўны ўдзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Асобна — стэнды, прысвечаныя ветэранам Вялікай Айчыннай і тым, хто ваяваў у Афганістане. **Начальнік Гомельскага абласнога ўпраўлення дэпартамента аховы Аляксандр ЛІСІМАЎ** падкрэслівае, як важна ведаць сваю гісторыю.

— У нас да гэтага не было свайго музея. Мы ў гэтую залу будзем запрашаць маладых супрацоўнікаў, расказваць ім пра тое, як нашы службоўцы працавалі раней. Усяго за тыдзень у комплексе будзе займацца каля 750 чалавек. Нашы інструктары — заслужаныя майстры спорту, ёсць удзельнікі Алімпійскіх гульняў.

Начальнік дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь генерал-маёр міліцыі Сяргей ХАМЕНКА адзначае, што паляпшаць сваю прафесійную форму ў новым будынку будуць не толькі супрацоўнікі, якія забяспечваюць парадак у Гомелі:

— Плануецца, што цэнтр прафесійнай падрыхтоўкі і службова-прыкладных відаў спорту будзе выкарыстоўвацца як для супрацоўнікаў дэпартамента аховы, так і для іншых праваахоўных ведамстваў. Займацца тут будуць і навучэнцы профільных класаў сярэдніх школ, і члены сем'яў міліцыянераў. У будучыні, акрамя таго, прапрацоўваецца магчымасць аказання платных паслуг і жыхарам найбліжэйшых мікрараёнаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара